Потомство Всеволода, учитывая все те же условия при подсчете, около 91 года. Конечно, в данном случае Всеволод будет преобладать над Изяславом в силу того, что его потомство имеет несколько ветвей: Мономашичи, Ростиславичи, Мстилавичи. Также мы можем проанализировать полученные данные в отношении продолжительности нахождения каждой из ветвей на киевском княжении и прийти к такому выводу: ветвь Ольговичей пробыла на Киевском столе около 33 лет (опять же, учитывая годы соправительства), смоленские Мстиславичи пробыли у власти в общей сложности 20 лет. Однако Мономаховичи сидели на Киевском столе около 31 года. Ростиславичи сидели в Киеве около 41 года.

**Заключение.** По полученным данным, можно следить вывод о следующем, что дольше на киевском столе среди всех представителей, занимавших титул Великого князя киевского, сидел Святослав Всеволодович Черниговский из династии Ольговичей. Но сумма правления всех правителей уступает ветви Ростиславичей. Также мы определились, что в целом потомство Всеволода Ярославича одержало вверх над всеми остальными претендентами на великокняжеский стол киевский.


1. Толочко А.П. Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология/ Толочко А.П. - К.: Наукова думка, 1992. – 36 с.
2. Ипатьевская летопись // ПСРЛ. Т.2. / Изд. Археографической комиссии (литографированное). СПб., 1908. -198 с. 6. Повесть временных лет / Подгот. текста, ст. и коммент. Д. С. Лихачева. Перевод Д. С. Лихачева и Б. А. Романова. Под ред. В. П. Адриановой Перетц. Ч. 1–2. М.; Л.: Изд-во Акад. Наук СССР, 1950. – 398 с.
3. Пресняков А.Е. Княжое право в Древней Руси. Лекции по русской истории. Киевская Русь. / Пресняков А.Е. - М.: Наука, 1993 г. – 64 с.
4. Котляр Н.Ф. Удельная раздробленность Руси. / Н. Ф. Котляр. - Санкт-Петербург: Наука, 2017. - 55 с.
5. Толочко А.П. Князь в Древней Руси: власть, собственность, идеология/ Толочко А.П. - К.: Наукова думка, 1992. – 42 с.
6. Толочко П.П. Киев и Киевская земля в эпоху феодальной раздробленности Древней Руси, 30-е годы XII - 30-е годы XIII в. / Толочко П.П. - Киев, 1980. - 180—183 с.
7. Соловьев С.М. История России с древнейших времен в 18 книгах / С. М. Соловьев. - отв. ред. Иванов Н. А.. - Москва: Голос, 1993. Т.2. - Гл.6. 512 с.


## СТАНОЎЧЫ ЎПЛЫЎ САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТАК НА ЖЫЦЦЁ МОЛАДЗІ


***Карповіч Д.У., Вялічка К.Э.,***
*студэнткі 2 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Далімаева Я.А., ст. выкладчык


У наш час падаўляючая большасць людзей з’яўляецца карыстальнікамі разнастайных інфармацыйных сродкаў. Камп’ютар, інтэрнэт увайшлі ў сучаснае жыццё настолькі шчыльна, што мы ўжо не ўяўляем сабе, як можна жыць і працаваць без іх. Асабліва цесная сувязь з інфармацыйнымі сродкамі назіраецца ў дзяцей і моладзі [1]. Сацыяльныя сеткі адкрываюць шмат новых магчымасцей. З дапамогай сацыяльных сетак моладзь наладжвае камунікацыю, заводзіць новыя знаёмствы, а таксама шукае неабходную інфармацыю. Аднак ёсць і адмоўныя аспекты выкарыстання сацыяльных сетак [2, с. 116]. У гэтым даследаванні мы вырашылі спыніцца выключна на аглядзе пазітыўнага стаўлення да ролі сацыяльных сетак у жыцці індывіда.

Мэта даследавання: вызначыць, якую ролю ў станоўчым плане адыгрываюць сацыяльныя сеткі ў жыцці моладзі.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для работы паслужылі вынікі праведзенага сацыялагічнага даследавання сярод студэнтаў ВДУ імя П.М. Машэрава. Усяго былі апытаныя 63 чалавекі. Метадалагічную базу складаюць агульнанавуковыя метады даследавання (аналіз, сінтэз, параўнанне, абагульненне) і метады збору і аналізу сацыялагічнай інфармацыі (анкетаванне, ранжыраванне, шкаліраванне).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Па выніках апытанння мы выявілі, што 71,4% рэспандэнтаў заходзяць у сацыяльныя сеткі ў любую вольную хвіліну: на перапынках паміж парамі, у чэргах і інш., таму выкарыстанне сацыяльных сетак з'яўляецца неад'емнай

часткай жыцця моладзі. Апытанне паказала, што студэнты карыстаюцца наступнымі сацыяльнымі сеткамі: 98,4% - VK, 96,8% - Telegram, 95,2% - Viber і Instagram, 77,8% - Tik Tok, 34,9% - Skype. Некаторыя (1,6 %) рэспандэнты выкарыстоўваюць яшчэ і Discord, Ok, Twitter, Facebook, Spotify, Youtube, WhatsApp. Reddit. Са статыстыкі вынікае, што ёсць сацыяльныя сеткі, якім моладзь аддае перавагу, і тыя, якімі абмяжоўваюцца некалькі чалавек. Гэта абумоўлена спектарам магчымасцей, якія даюць сацыяльныя сеткі. Моладзь выкарыстоўвае сацыяльныя сеткі для камунікацыі з сябрамі (98,4%), праслухоўвання музыкі (82,5%), прагляду фільмаў, кліпаў (58,7%), знаёмства з новымі людзьмі (54%), працы (54%), назірання за старонкамі медыа-зорак (46%), здзяйснення пакупак (34,9%), пошукаў кніг, артыкулаў (33,3%), атрымання інфармацыі, у тым ліку і пра брэнды (22,2%), гульняў (22,2%), вучобы (1,6%).

У апошні час значную ролю ў жыцці моладзі пачала адыгрываць камунікацыя праз сацыяльныя сеткі. Сёння моладзь часта камунікуе праз сацыяьныя сеткі. Звычка ўзаемадзейнічаць адно з адным віртуальна з'явілася ў людзей у выніку развіцця інтэрнэт-тэхналогій. З дапамогай інтэрнэта стала прасцей знаёміцца з людзьмі, якія падабаюцца: для гэтага зараз не абавязкова кантактаваць з імі вербальна, дастаткова завесці старонку ў сацыяльных сетках. Знаёмствы, заведзеныя ў сацыяльных сетках, могуць не выходзіць за межы інтэрнэт-прасторы. Колькаць сяброў анлайн і ў рэальным жыцці можа не супадаць. Па выніках апытання мы выявілі, што большасць рэспандэнтаў мае ў сацыяльных сетках 51-100 сяброў (44,4%), менш - да 50 (22,2%), яшчэ менш - 101-200 (20,6%) і невялікая колькасць апытаных мае больш за 200 анлайн-сяброў, у той час, як у рэальным жыцці яны маюць стасункі толькі з 10-40 сябрамі (35%). Большасць апытаных (52,4%) ведаюць усіх анлайн-сяброў асабіста. Нягледзячы на лёгкасць віртуальнай камунікацыі, 68,3% студэнтаў аддае перавагу зносінам "ужывую". Гэта абумоўлена наступнымі прычынамі: рэспандэнты жадаюць мець вербальны кантакт, бачыць эмоцыі і пачуцці суразмоўцы. Студэнты, якія аддаюць перавагу віртуальнай камунікацыі, кіруюцца тым, што яна адцягненая ў часе, можна больш дакладна сфармуліраваць свае думкі, схаваць эмоцыі, пазбегнуць выпадковых адказаў.

Праведзенае даследаванне паказала, што сацыяльныя сеткі аказваюць значны ўплыў: 93,7% апытаных лічаць, што соцсеткі як станоўча, так і адмоўна ўплываюць на моладзь, 4,8% - не ўплываюць, 1,6% - адмоўна. З дапамогай сацыяльных сетак чалавек можа камунікаваць з людзьмі, якія жывуць у розных гарадах і краінах, а таксама заводзіць новыя знаёмствы, што спрыяе развіццю камунікабельнасці. Некаторыя людзі выкарыстоўваюць сацыяльныя сеткі для працы, вучобы, гульняў. У інтэрнэт-прасторы размешчана шмат разнастайнай інфармацыі, якая спрыяе living разнабаковаму развіццю асобы і пашырэнню кругагляду.

**Заключэнне.** Даследаванне паказала, што студэнты з’яўляецца актыўнымі карыстальнікамі сацыяльных сетках. Перавага аддаецца сацыяльным сеткам, якія даюць большы спектар магчымасцей (VK, Telegram, Viber, Instagram). Галоўнай перавагай сацыяльных сетак з’яўляецца іх шматграннасць. Яны служаць для камунікацыі, працы, забаў. Нягледзячы на папулярны стэрыатып, што сацыялныя сеткі могуць выцесніць жывую камунікацыю, мы выявілі, што моладзь не гатовая абмежавацца стасункамі ў сацыяльных сетках. Большасць рэспандэнтаў жадаюць мець вербальны кантакт, бачыць пачуцці і эмоцыі суразмоўцы. Такім чынам, сацыяльныя сеткі маюць станоучы ўплыў на жыццё моладзі. Ёсть і адваротны бок уплыву сацыяльных сетак на моладзь, але гэтая тэма з’яўляецца аб'ектам іншага даследавання.

1. Трыбуна працы // Новости Бобруйского района //Сацыялізацыя падрастаючага пакалення ў сучасных умовах – Рэжым доступа: https://www.tribunapracy.by/2014/03/sacyyalizacyya-padrastayuchaga-pakalennya-ÿ-suchasnyx-umovax/ Дата доступа: 30.12.2022.

2. Далимаева, Е. О. Отношение студентов к буллингу в Интернете / Е. О. Далимаева // Наука - образованию, производству, экономике : материалы 74-й Региональной научно-практической конференции преподавателей, научных сотрудников и аспирантов, Витебск, 18 февраля 2022 г. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2022. – С. 116-117.